# *ФИЛОСОФИЯ*

УДК 165.6/8

## ТЭТЭНС ЯК ТЭАРЭТЫЧНЫ ПАПЯРЭДНІК КАНТА

***канд. філас. навук, дац. Р.Д. ГРУДНІЦКІ***
***(Полацкі дзяржаўны універсітэт)***

*Творчасцъ выдатнага нямецкага філасофа-асветніка Ё.М. Тэтэнса даследуецца ў кантэксце фарміравання ідэі актыўнасці суб 'екта пазнання ў нямецкай філасофіі другой половы XVIII стагоддзя.*

Ёган Мікалаус Тэтэнс - адзін з выбІтнейшых прадстаўнікоў нямецкай Асветы. 3 «папулярнай філасофіяй» яго лучыць арыентацыя на вопыт. Ад как філасофская творчасць Тэтэнса выходзіць не толькі далёка за межы праблемнага кола «папулярнай філасофіі», але, у пэўнай ступені, і за межы асноўнай кулыурнай праблематыкі Асветы. Калі для «папулярных філосафаў» галоўным з’яўляецца распрацоўка рэкамендацый, якія спрыяюць дабрачыннаму жыццю і выхаванню грамадзянІна ў духу ідэй і каштоўнасцей Асветы, то Тэтэнсу ўласціва імкненне да аналізу прыроды чалавека ў традыцыях тэарэтычнай філасофіі. Гэтая акалічнасць разам з тымі цяжкасцямі, з якімі сутыкнулася «папулярная філасофія», абумовіла і той факт, што Тэтэнс паслядоўна і больш рашуча, чым хто-небудзь з прадстаўнікоў гэтай філасофскай плыні, звяртаецца да рацыяналістычнай традыцыі. 3 самага пачатку Тэтэнс перакананы ў тым, што хоць усе нашыя веды паходзяць з вопыту, але гэтыя вопытныя дадзеныя з неабходнасцю павінны быць дапоўнены высновамі розуму. Без гэтага ўзаемадапаўнення няма і не можа быць аніякай навукі. Таму спекулятыўная філасофія, пад якой, словамі Тэтэнса, у Германіі разумеюць метафізіку [1, с. 17], з’яўляецца не антыподам філасофіі папулярнай, а яе неабходным дапаўненнем і завяршэннем. «Тэта сапраўдная душа філасофіі і яе мэта, якая, пры ўсіх памылках асобных філосафаў, усё ж усведамляецца як мэта, да якой прыходзяць сістэматычныя філосафы, што хочуць адрозніваць сябе ад філасофскіх рэзанёраў» [1, с. 12-13].

Але калі вопыт не можа абыйсціся без высноў метафізікі, то і метафізіка без вопыту ператвараецца ў звычайную фармальна-лагічную канструкцыю, пазбаўленую якога-небудзь рэальнага зместу. Метафізіка заўжды павінна мець перад вачыма вопыт і глядзець на яго «як на бераг і маяк і адразу ж паварочваць назад, як толькі губляе яго з вачэй» [1, с. 15]. Але ці магчыма гэтая метафізіка як навука? Ці сапраўды ляжыць яна ў межах чалавечага розуму? Ці не будзе яна, як той філасофскі камень, уводзіць у зман нашы спадзяванні? В ось галоўныя пытанні філасофскай творчасці Тэтэнса. І хоць усе гэтыя пытанні вельмі шырокія і далёка выходзяць за межы нашага даследавання, усё ж аналІз разумения суб’екта пазнання, яго прыроды і яго тэарэтычных магчымасцей будзе ў пэўнай ступені адказам і на іх. Пакуль жа дастаткова адзначыць толькі тое, што Тэтэнс упэўнены ў магчымасці такой метафізікі. У сувязі з характарыстыкай выразнасці і ападыктычнасці матэматычных паняццяў Тэтэнс заўважае, што і ў метафізіцы «мы можам мець такія прынцыпы, якія, - я не сумняваюся ў гэтым, - самі па сабе гэткія вызначаныя, рэальныя, дакладныя і ў сваёй усеагульнасці надзейныя гэтак жа, як і геаметрычныя паняцці» [1, с. 23].

Ужо гэтыя папярэднія заўвагі сведчаць пра тое, што Тэтэнс ставіць перад сабой задачу пабудовы метафізікі розуму. Прычым такой метафізікі, якая б у сваіх высновах валодала ўсеагульнасцю і неабходнасцю ды адначасова мела б вопытнае прымяненне. Тэта значыць, такой метафізікі, якая б разам з фармальна-лагічным мела і аб’ектыўна-змястоўны статус. Гэтую задачу Тэтэнс вырашае ў сваім двухтомным творы 1777 года «Філасофскія вопыты аб чалавечай прыродзе і яе развіцці» (Tetens J.N. Philosophische Versuche über die menschliche Natur und ihre Entwiklung), які ў новым выданні быў надрукаваны ў Берліне ў 1913 годзе. Тэматыка гэтага твора завяршае ў асноўным імкненне асветніцкага эмпірызма ды і першапачатковую філасофскую ўстаноўку ўсяе нямецкае Асветы абгрунтаваць самадзейную прыроду суб’екта, аўтаномная дзейнасць якога не супярэчыць аб’ектыўна-змястоўнаму характару створаных ім каштоўнасцей. І адначасова тэматыка гэтага твора акрэслівае тое кола праблем, разважанні над якімі далі пачатак новай магутнай інтэлектуальнай плыні ў Германіі - нямецкай класічнай філасофіі.

Эмпірызм, а ў пэўнай ступені нават і сенсуалізм, выступаюць несумненным падмуркам тэарэтычных пошукаў Тэтэнса. Ужо ў невялічкай працы 1775 года «Аб усеагульнай спекулятыўнай філасофіі» ён падкрэслівае той факт, што «аб прадметах нашага роуму мы даведваемся не інакш, як адно толькі праз нашыя ўяўленні» [2, 3]. К таму часу, калі з’явіліся «Вопыты», гэтае перакананне яшчэ больш узмацнілася. Усякае пазнанне пачынаецца з вопыту. Менавіта ў вопыце выяўляецца дваістая прырода суб’екта.

З аднаго боку, ён выступае як пасіўна-залежная істота, што ўбірае ў сябе ўражанні, прычына якіх чужая яго ўнутранай прыродзе. Але ён адначасова актыўны і дзейны. Яго актыўнасць выяўляецца як тады, калі ён мяняе свае ўнутраныя станы, так і тады, калі ён прыводзідь у рух некаторыя часткі свайго цела з тым, каб мяняць знешнія прадметы. Усе пасіўныя перажыванні, хваляванні і станы, а таксама суб'ектыўныя дзеянні разам ёсць не чым іншым, як адчуваннямі і ўражаннямі. Вынікам гэтых змяненняў, якія адбываюцца ў суб'екце праз уздзеянне на яго знешніх прадметаў, а таксама ўласныя ўнутраныя ўздзеянні на свае здольнасці, з'яўляюцца трывалыя сляды. Характар гэтых слядоў залежыць ад характару прычын, што іх вызываюць, гэта значыць - ад папярэдніх змяненняў і станаў суб'екта, якія і складаюць гэтыя сляды.

«Такія сляды, пакінутыя ў нас праз нашы мадыфікацыі, якія паддаюцца новай адбудове альбо развіццю дзякуючы дадзенай нам здольнасці, называюцца нашымі ўяўленнямі» [1, с. 16]. Уяўленні, такім чынам, паўстаюць як аднаўленне вобразаў прадметаў знешняга вопыту, якія раней уздзейнічалі на суб'ект і змянялі яго станы. Нават калі паўторна яны аднаўляюцца ў той форме, у якой з'яўляюцца ўпершыню, усёроўна яны складаюцца з гэтых слядоў. Таму сляды гэтыя з'яўляюцца першаснымі асноўнымі ўяўленнямі (urspriingliche GrUndvorstellungen.) Першасныя ўяўленні ўзнікаюць з актуальных змяненняў і станаў суб'екта. А, у адпаведнасці з азначэннем, такімі актуальнымі змяненнямі з'яўляюцца адчуванні. Апошнія і выступаюць у якасці прычыны першасных уяўленняў. Першасныя ўяўленні - гэта вобразы, якія ўзнікаюць у выніку адчування рэчы. Яны таму аднаўляюць рэч такой, якой яна адчуваецца. Характэрнай адметнасцю першасных пачуццёвых уяўленняў ёсць іх выразнасць і сувязь з прадметам, чаго няма пры паўторным аднаўленні вобраза прадмета. Менавіта таму яны з'яўляюцца асновай усіх іншых уяўленняў. Гэта і ёсць поле, якое падлягае апрацоўцы з боку суб'екта. Суб'ект валодае здольнасцю раскладаць гэтыя ўяўленні, раздзяляць і злучаць іх, звязваць і састаўляць асобныя элементы І часткі. Гэта азначае, што здольнасць уяўлення «разгаліноўваецца» на тры здольнасці: здольнасць прымаць уяўленні, здольнасць аднаўлення і пераўтварэння іх (альбо перцэпцыя) і фарміруючая здольнасць тварэння.

Перцэпцыя, альбо «здольнасць схоплівання», гэта здольнасць суб'екта атрымліваць уяўленні ад уражанняў, выкліканых уздзеяннем прадметаў, і ўтрымліваць і захоўваць іх у перажыванні ў якасці падобных прадметам пазнання. На гэтым узроўні вобразы і іх прыкметы паўстаюць у тым парадку, у якім яны абумолены сваімі прычынамі.

Здольнасць уяўлення, альбо фантазія, - гэта здольнасць суб'екта аднаўляць вынікі перцэпцыі пасля таго, як спыняюцца першасныя ўяўленні. Гэта, па сутнасці, здольнасць на падставе перцэпцыі нанова ствараць вобразы прадметаў у такой форме, у якой яны могуць быць успрынятыя ў свядомасці. Вынікам дзейнасці здольнасці фантазіі з'яўляюцца другасныя ўяўленні. Ад першасных яны адрозніваюцца дваяка: па-першае, яны валодаюць значна меншай жывасцю, а па-другое, калі першасныя ўяўленні звязаны ў той паслядоўнасці, у якой яны інспіраваны сваімі прычынамі, то ў фантазіі гэтая паслядоўнасць можа парушацца. Здольнасць фантазіі аб'ядноўвае не толькі тыя ўяўленні, якія выкліканы відавочна падобнымі прычынамі, але і любыя ўяўленні і іх элементы, калі яньг маюць хоць бы адну агульную рысу, што паддаецца выяўленню. Гэтыя агульныя рысы і бакі «сходзяцца адна з адной», падабенства іх утварае своеасаблівыя «пункты сувязі ўяўленняў», тыя месцы, «у якіх фантазія можа непасрэдна пераходзіць ад аднаго з іх да многіх іншых, ад якога-небудзь шэрагу ўяўленняў да другога шэрагу, які, аднак, у саміх уражаннях паводле часу і месца быў дастаткова аддалены ад першага [1, с. 204 - 205]. У гэтым, паводле Тэтэнса, і заключаецца сутнасць закона асацыяцыі ідэй.

Варта адзначыць, што ўжо на гэтым узроўні становіцца відавочны той факт, які вызначае самы істотны недахоп у поглядах Тэтэнса. «Уяўляючая дзейнасць» менш за ўсё зарыентавана на рэальную сувязь прыкмет прадмета. Яна пераўтварае і фармуе пачуццёвы матэрыял, зыходзячы выключна з унутраных суб'ектыўных здольнасцей. Небяспека суб'ектывізма і рэлятывізма, звязаная з паслядоўнай эмпірычнай арыентацыяй Тэтэнса, тут яшчэ большая, чым у яго паплечнікаў па «папулярнай філасофіі» [3].

Асацыятыўная дзейнасць здольнасці фантазіі не завяршае тых пераўтварэнняў, якія здзяйсняе суб'ект у сферы пачуццёвых уяўленняў. Тут дзейнасць суб'екта абмежавана. Яна скіравана на аб'яднанне вобразаў паводле прынцыпа падабенства, гэта значыць - зводзіцца да ўладкавання пачуццёвага матэрыяла.Ва ўсім жа астатнім суб'ект застаецца залежным ад першасных пачуццёвых уяўленняў. Гэта значыць, што і на ўзроўні перцэпцыі, і ў сферы здольнасці фантазіі ён, па сутнасці, застаецца пасіўнай істотай. Яго дзейнасць абмежавана толькі дзейнасцю ўспрыняцця, яна не мае ў сабе нічога канструктыўнага. У гэтым сэнсе ідэі, якія развівае Тэтэнс, калі не звяртаць увагу на іх форму, зусім не арыгінальныя і амаль дакладна ўпісваюцца ў суб'ектыўна-ідэалістычную схему, створаную Берклі і Юмам.

«Уяўляючая здольнасць» валодае яшчэ адным відам дзейнасці, які якасна адрозніваецца як ад перцэпцыі, гэтак і ад фантазіі. У падмурку гэтай дзейнасці ляжыць творчая сіла суб'екта. Дзякуючы гэтай сіле суб'ект можа ствараць такія вобразы, якія для свядомасці набываюць форму першасных, хоць яны і не падобныя на іх. На гэтым узроўні суб'ект здольны выявіць у першасных уяўленнях адметныя

рисы, недаступныя для фантазіі, і аб'яднаць іх у такую цэласнасць, якая надае ім выгляд новага простага ўяўлення. Гэта значыць, творчая сіла суб'екта ўяўляе сабой не яго здольнасць фарміраваць цэласныя канструкцыі, што могуць быць раскладзены на часткі, кожная з якіх належала б першаснаму ўяўленню. На думку Тэтэнса, гэта самае банальнае разумение здольнасці тварэння. Творчая прырода суб'екта заключаецца ў яго здольнасці самастойна канструяваць новыя першасныя ўяўленні, матэрыял для якіх заўжды дадзены толькі ў досведзе, але форма з ніякага досведу не выводзіцца і ад ніякага досведу не залежыць. Яна ёсць вынікам творчай актыўнасці суб'екта, яго фарміруючай здольнасці тварэння.

«Свае ўяўленні душа можа не толькі лакалізаваць і ўладкаваць, як глядач у карціннай галерэі, яна сама ёсць таксама і мастаком, што адкрывае і састаўляе новыя фарбы». Фарміруючая здольнасць тварэння - гэта функция творчай сілы. Межы яе прасціраюцца значна далей, чым прынята думаць. Гэта не проста паэтычная творчасць, а самадзейная фантазія, істотньг элемент гекіяльнасці ў шырокім сэнсе гэтага слова, я кое не абмяжоўваецца толькі паэтычнай геніяльнасцю [1, с. 105 - 106].

У якой жа паслядоўнасці ажыццяўляецца пазнавальная дзейнасць суб'екта? Першасны пачуццёвы матэрыял хоць і нараджаецца ў суб'екце як разнастайнасць, аднак паўстае як нейкае неакрэсленае адзінства. Гэта адбываецца таму, што пачуццёвыя ўражанні, якія ўзнікаюць пад уздзеяннем розных прычын, успрымаюцца суб'ектам як падобныя адно да аднаго праз іх нераздзельнасць. Таму першым актам суб'екта з'яўляецца раздзяленне пачуццёвай няпэўнасці і класіфікацыя яе элементаў. Гэтую задачу выконвае аперцэпцыя. Сіла мыслення ў неакрэсленым пачуццёвым матэрыяле выдзяляе адчуванні, выкліканыя змяненнем нашай пазнавальнай здольнасці, і аддзяляе іх ад адчуванняў, што выкліканы змяненнямі нашага цела і ўздзеяннем на нас знешніх прадметаў.

Дзякуючы гэтай класіфікацыі пачуццёвых уражанняў і на яе падставе сіла мыслення стварае галоўныя ідэі, якія паўстаюць асновай пазнавальнага працэса. У працэсе тлумачэння і асэнсаваня пачуццёвых уражанняў, што выклІканы зменамі пазнавальнай здольнасці, сіла мыслення стварае ідэю свайго Я. Аналіз уражанняў, якія ўзнікаюць на падставе змяненняў розных органаў, нараджае ідэю свайго цела. Нарэшце, разважанні над уражаннямі, што выкліканы прычынамі, чужымі як для Я, гэтак і для цела, фармуюць ідэю знешняга аб'екта, рэальнага існаванняя, якое адрозніваецца ад Я [1, с. 370].

Наступнае дзеянне пазнання - гэта класіфікацыя матэрыяла ўнутры выдзеленых класаў. Напрыклад, у сферы свайго Я суб'ектыўная здольнасць пазнання аддзяляе ўражанні, выкліканыя дзеяннямі розуму, ад уражанняў, вызваных дзеяннем волі. Унутры другога класа выдзяляюцца ўражанні, кароджаныя адной часткай цела, ад уражанняў у другой яго частцы. Нарэшце, унутры трэцяга класа яна аддзяляе адно ад аднаго ўражанні, выкліканыя employee рознымі пачуццямі. Дзякуючы гэтаму, пазнаючая душа набывае здольнасць разважаць аб прадметах, якія знаходзяцца альбо ў ёй, альбо ў пэўнай частцы цела, альбо па-за ім. З гэтага факта сіла мыслення выводзіць галоўнае правіла, якое з'яўляецца крытэрыем раздзялення суб'ектыўнага і аб'ектыўнага існавання. «Усякае адчуванне мы змяшчаем у той рэчы, у якой адчуванне яе ўтрымліваецца як частка ў цэлым. Карацей, усякае адчуванне ставіцца туды, дзе мы яго адчуваем. Тады яно адчуваецца там і ў тых рэчах, дзе і ў якіх заключаецца адчуванне іх саміх» [1, с. 405].

Фарміруючая здрольнасць тварэння падобная да творчай сілы прыроды. Апошняя хоць і не стварае ніякай новай матэрыі, аднак на падставе разлажэння разнастайных матэрыяльных цел, іх пераўтварэння і наступнага аб'яднання стварае новыя целы і новыя істоты, якія раней у такім выглядзе не існавалі, Зыходным матэрыялам прыроднага акта тварэння з'яўляецца матэрыя, але сваім існаваннем створаныя прадметы і істоты абавязаны не матэрыі, а прыроднай творчай сіле. Штосьці падобнае адбываецца і ў суб'екце. «Матэрыял» для сваёй дзейнасці фарміруючая здольнасць тварэння знаходзіць у сферы першасных уяўленняў. Але вынікі гэтай дзейнасці ў той форме, у якой яны створаны, нельга знайсці ні сярод першасных пачуццёвых уяўленняў, ні нават сярод адчуванняў. Яны - не ілюзіі, бо створаны з наяўнага матэрыяла першасных уяўленняў. Але яны і не рэальнасць, бо ў той форме, у якой яны створаны, знайсці іх у досведзе нельга.

Па сутнасці, гаворка тут ідзе пра суб'ектыўную здольнасць канструявання каштоўнасцей, мэтаў і ідэалаў чалавека. Яны рэальныя ў тым сэнсе, што створаны на падставе жыццёвага досведу чалавека і здольны ўплываць на яго паводзіны і мяняць яго інтэлектуальнае аблічча. Але яны і не рэальныя, бо ва ўласцівай ім форме адшукаць іх у жыццёва-практычным досведзе чалавека немагчыма. Таму здольнасць тварэння стварае не свет і не прадметы гэтага свету. Яна ўпершыню канструюе значэнне і сэнс гэтых прадметаў адносна ўласнай чалавечай прыроды. Свет, сканструяваны фарміруючай здольнасцю тварэння, - гэта свет мэтаў, сфера каштоўнасцей, ідэалаў і сэнсаў, зразумелая як спецыфічна чалавечы свет культуры. Пры гэтым культуру тут разумеюць у вузкім сэнсе слова як чыста інтэлектуальную дзейнасць і яе вынікі. В ось жа чаму, негде дзячы на ўсе намаганні, асветніцкая думка не можа зразу медь прыроду актыўнасці суб'екта. Не можа зразумець яе менавіта як свядомую практичную дзейнасць, скіраваную на пераўтварэнне прыроды з мэтай задавальнення разнастайных патрэб; дзейнасць, вынікі якой залежаць ад узроўню развіцця наяўных матэрыяльных сродкаў яе. Яна таму не можа зразумець суб'ект найперш як суб'ект практычнага дзеяння, які толькі дзякуючы гэтаму і на падставе гэтага можа выступаць і ў якасці суб'екта тэарэтычнага

дзеяння. Такая трактоўка актыўнасці суб’екта яшчэ не ўласціва не толькі асветнікам, але і Канту і нават Гегелю, Для такой трактоўкі яшчэ не наспеў час, не склаліся адпаведныя ўмовы.

Тут жа актыўнасць разумеюць як «самадзейнасць» інтэлекта ў ідэальнай сферы культуры, якая стаіць над рэальным светам і па-за ім. Таму тут і не заўважаюць сувязі паміж ідэяй і прадметам, паміж сферай культуры і сферай рэальнасці эмпірычнага існавання. Таму, нарэшце, гэткімі марнымі з’яўляюцца спробы асветнікаў абгрунтаваць аб’ектыўную змястоўнасць вынікаў суб’ектыўна-актыўнай дзейнасці, растлумачыць спосабы сувязі свету ідэй і свету рэчаў. Марнымі аказаліся спробы разарваць сферу чыстай суб’ектыўнасці і вывесці суб’ект вонкі, за яго ўласныя межы, і пры гэтым не разбурыць аўтаномнасць яго спецыфічна чалавечай прыроды. Эмпірычная трактоўка суб’екта пазнання вядзе да таго, што чыста суб’ектыўнае жыццё на дзіва прамалінейна атаясамліваецца з аб’ектыўна-рэальным светам. У выніку эмпірычны вопыт напаўняецца ілюзорным зместам, з якога выдаляюцца ўсе сляды рэальнасці. Існасць жа суб’екта зводзіцца да гарманічнага псіхафізічнага адзінства разнастайных «здольнасцей душы», у якім розум узгадняецца з пачуццёвасцю, і гэтая ўзгодненасць забяспечваецца адчуваннем. Самое ж цэласнае поле жыццядзейнасці чалавека, умовай ажыццяўлення якой з’яўляецца спантанная актыўнасць суб’екта, распадаецца на тры самастойныя сферы. Гэта сфера мастацтва, дзе суб’ектыўная актыўнасць праяўляецца як здольнасць паэтычнай творчасці; сфера тэорыі, дзе актыўнасць праяўляецца як «сіла мыслення», што канструюе агульныя паняцці; нарэшце, гэта сфера маральнасці, у якой актыўнасць праяўляецца як «самадзейнасць душы», што дазваляе свабодна выбіраць напрамкі дзейнасці і абгрунтоўваць аб’ектыўнасць гэтага выбару.

«Сіла мыслення» тут адно толькі дэкларуецца, бо пытанне аб яе канструктыўных здольнасцях, а тым больш пытан не аб крыніцах паходжання і ўмовах існіннасці агульных паняццяў, тут не знаходзіць адказу. Аналіз жа гэтых трох сфер, здзейснены эмпірызмам, прывёў філасофскія даследаванні да наступных высноў:

1) адзінай крыніцай пазнання з’яўляецца досвед як сфера суб’ектыўных адчуванняў;

2) прырода рэальных прадметаў абумоўлена Іх пачуццёвай дадзенасцю і даступная для пазнання ў алагічнай сферы перажыванняў і не паддаецца паняційнай апрацоўцы;

3) паколькі адзіныя адносіны навукі да рэчаіснасці магчымы як па-за пазнавальныя адносіны ў сферы пачуццёвага жыцця, то навуковае пазнанне ў дакладным сэнсе гэтага слова немагчыма.

У тэарэтычным сэнсе апошняя выснова прадвырашана сама меней дзвюмя акалічнасцямі: пануючым разумением філасофіі і ўласцівай для таго часу ацэнкай прыроды навуковых ведаў. Філасофія, ці ў тэрміналогіі Тэтэнса, «усеагульная трансцэндэнтальная філасофія» ёсць навукай аб прыродзе «рэчаў увогуле», але не з пункту гледжання іх рэальнага існавання, а з пазіцыі таго, што з’яўляецца магчымым і неабходным ва ўсялякІх рэчах наогул. Таму філасофія, нават у сваёй гнасеалагічнай частцы, выступае я к анталогія, як вучэнне аб памежных асновах быцця, гэта значыць як метафізічная мадэль свету, збудаваная на падставе «першых прынцыпаў чыстага розуму».

Такое разумение філасофіі вымагала пэўнай мадэлі навукі і вызначала статус навуковых ведаў. Навуцы, па сутнасці, прыпісваліся тыя самыя меркі, якія вызначалі аблічча метафізікі, а для навуковых ведаў патрабавалі, з аднаго боку, усеагульнасці і неабходнасці, а з другога - аб’ектыўнай змястоўнасці. Аднак аб’ектам філасофскага даследавання і ацэнкі была вопытна-эксперыментальная навука, Таму, незалежна ад таго, якая з асноўных пазнавальных здольнасцей - чысты розум як гарантыя ападыктычнасці, ці вопыт, які забяспечвае аб’ектыўную змястоўнасць ведаў, - прымаецца зыходнай, філасофія не знаходзіць ніякай сувязі як паміж гэтымі здольнасцямі, так і паміж характарыстыкамі ведаў, якія забяспечваюць ім статус навуковасці. Таму філасофія кожны раз стаіць перад невырашальнай з яе пункту гледжання праблемай: альбо ападыктычнасць ведаў, але і іх змястоўная пустата, альбо аб’ектыўная змястоўнасць ведаў, але і іх прыватны і выпадковы характар. А паколькі гэтая праблема адначасова з’яўляецца і крытэрыем ацэнкі статуса канкрэтных навук, то яго прымяненне непазбежна прыводзіць да сумнення ў іх навуковасці.

Здзейснены асветніцкай філасофіяй аналіз лагічнай сувязі паміж катэгарыяльным апаратам эксперыментальнага прыродазнаўства і зместам вопытных дадзеных, якія для гэтых навук выступаюць у якасці аб’екта пазнання, прывёў да высновы аб тым, што ўласцівая гэтым катэгорыям прыкмета ўсеагульнасці і самі гэтыя катэгорыі з’яўляюцца толькі вынікам актыўна-пазнавальнай дзейнасці суб’екта. Праз гэта ў рэальным свеце гэтым катэгорыям нічога не адпавядае. Аб’ектыўная змястоўнасць, а значыць, і існіннасць гэтых катэгорый забяспечваецца эмпірычным матэрыялам. Але менавіта гэтая эмпірычная канкрэтнасць не толькі супярэчыць, але і выключав тую адзіную прыкмету, якая і надае ведам характар навуковасці - іх ападыктычнасць. Таму навука як аб’ектыўна-змястоўныя веды аб рэчаіснасці аказваецца немагчымай.

Гэтая парадаксальная выснова адносна магчымасці навуковых ведаў дапаўнялася шэрагам праблем, што да самой філасофіі. Па-першае, гэтая выснова выкрывала няздольнасць філасофіі дадзенага перыяда зразумець і ацаніць тую важнейшую пазнавальную з’яву, з якою яна сутыкнулася: новае

вопытна-эксперыментальнае прыродазнаўства. Гэта, у сваю чаргу, выявіла фундаментальную супярэчнасць, якая апанавала філасофіяй гэтага часу: супярэчнасць паміж імкненнем да ўсебаковага і паслядоўнага аналіза новай навукі і няздольнасцю філасофіі вызваліцца ад першапачатковых спекулятыўна-метафізічных гнасеалагічных установак. Гэта нараджала разбуральнае для філасофіі сумненне ў змястоўнасці яе ўласных установак і яе ўласнай навуковасці.

Сама ж філасофія ўсё больш і больш замыкаецца ў межах тэарэтыка-пазнавальнай тэматыкі і адначасова зводзіць гэтую тэматыку да аналіза тых «здольнасцей», якія ўдзельнічаюць у працэсе пазнання. Матэрыялістычная ці ІдэалІстычная арыентацыя не ўносіць істотных змен ў гэтую галоўную задачу. Яна толькі вызначае рознасць шляхоў і спосабаў яе вырашэння. Правамоцнасць і гнасеалагічную каштоўнасць суб'ектыўных здольнасцей імкнуцца абгрунтаваць альбо ў субстанцыяльнай цэласнасці разум нага свету, альбо ў чыста чалавечай сферы маральнай свабоды, дабрадзейнасці і шчасця. У выніку сама гнасеалагічная праблематыка губляе свой першапачатковы тэарэтыка-пазнавальны характар. Гэты тэарэтычны крызіс асветніцкай філасофіі стаў непасрэднай інтэлектуальнай перадумовай кантаўскіх даследаванняў.

## ЛІТАРАТУРА


1. Tetens J.N. Philosophische Versuche ubër die menschliche Natur und ihre Entwiklung. - Berlin, 1913. - 779 s.
2. Tetens J.N. Ober die allgemeine speculativische Philosophie, - Berlin, 1913.
3. Sulzers vermichte philosophische Schriften. - Berlin, 1800. - 738 s.